№ 7 Ausgabe B.

# ГОМАН

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Завальная 7.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі—25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці—60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 7 (203). Год III. Вільня, 22 студня 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.

ПЕЦЯРБУРГ (П.Т.А). 20. 1. Сягоньня глаўная камісія рад работнікаў, селян і салдатоў на надзвычайным заседаньні у 1 гадз. 30 мін. па палудні пастанавіла разпусьціць установчы сэйм.

## 21 студня.

Заходні тэатр:

Пры Іпэрн і на фронце ад Ленс да Эпэгы павялічаны артылерыйскі бой. У розных мясцох Шампані і з абодвых бакоў Маас артылерыйскіе бoi.

---

За апошніе два дні зьбіта 11 непрыяцельскіх самалётаў і адзін шар на прывязі.

---

ШТОКГОЛЬМ. У хуткім часе будзе становчя проба сіл між Ленінам і апазіцыэй каторай кіраўніком С. З. Чэрнов. Нятолькі партыя сацыял-рэволюцыонераў, але і правая часць бальшэвікоў можэ адлучыцца ад Леніна, каб прылучыцца да левых меньшэвікоў.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). У заходняй часьці блакаднай зона на вакол Англіі ізноў затапілі 19 тысяч тонн.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. Тэгеранскіе газэты наказываюць, што міністэрства с прычыны англіцкіх інтрыг у паўднёвай Пэрсіі вышла ў адстаўку.

БРУСЕЛЬ. Флямандзкая рада летась 22 сьнежня праклямавала урачыста і аднагалосна самабытнасьць Фляндрыі. Флямандзкая рада складывае цяпер с сябе свае паўнамочые, дадзеные ёй народам 4 лютага 1917 г, каб даць Флямандзкаму народу магчымасьць выказаць сваю волю аб гэтым абвешченьні.

ЛОНДОН. 20.I. (Рэўтер). У установчым сэйме у Пецярбурзе Сьвердлов прачытаў заяву аб правох работнікаў. Расейская рэспубліка павінна скасаваць прыватнае меньне, работнікі павінны быць уваружэны, а буржуі розаружены, павінна быць утворэна соцыялістычная армія і пазыкі скасаваны. Уся ўласць павінна належыць толькі да работніцкіх рад.

Матросы с штыхамі стаялі ў калідорах, а прад будынкам былі пастаўлены дзве гарматы. Установчы сэйм 273 гал. процi 140 пастанавіў да часу адлажыць заяву аб правох работнікаў, тады бальшэвікі і левые сацыял-рэвалюцыанеры вышлі с салі. Правые сацыял-дэмакраты прынялі тады пасьпешна сьцяг рэзалюцый.

БЭРЛІН. У аўторак адбудзецца гутарка статс-сэкрэтара Кюльманна с кіраўнікамі партый.

АФІНЫ. Быты міністэр Руфос арэштаваны. Яго вінаваццяць у здрадзе.

БЭРЛІН. Ваенная рада у Вэрсалі разглядала мэморандум аб вывадзе войска с Салёніцкага фронту. Англіцкіе прэдстаўнікі схіналіся таксама да гэтага, Амэрыка заявіла, што яна сваіх войск да Салёнік не пашле.

БЭРЛІН. Швайцарскіе газэты наказываюць з Вашынгтону аб тым, што Вільсон маніцца склікаць конфэрэнцію для канчальнага высьненьня варункаў міру. Нейтральнае гасударства, пэўне Гішпанія, пасьля перадасць гэные варункі цэнтральным гасударствам.

БЭРН. Англіцкая работніцкая газэта наказывае, што 4 мільёны 700 тысяч работнікаў дасталіададатак у 2 мільёны 200 тысяч фунтаў стэрлінгаў у тыдзень. Куплевая сіла фунта стрэрлінга за вайну зменшылася ў 10 разоў.

ЛЮГАНО. „Corriere della Sera" ў перадняй стацьці пішэ аб палажэньні краю ў самых цёмных хварбах. Эканаміцкае палажэньне немагчыма. Народу не хапае хлеба. Салдатам не хапае здаровай яды, а ваеннай нрамысловасьці не хапае сырызны і вугальля.

ШТОКГОЛЬМ. З розных мейсц Расеі ідуць весьці, што контррэволюцыанеры робюць вялікіе прыгатаўленьні для зьнішчэньня ўраду бальшэвікоў. Корнілов, Савінков, Філоненко і Гучков кіраўнікамі руху, каторага цэнтрам Самара і Новачэркаск. „Саюз ратаваньня установчага сэйму" дастае праз Токіо вялізарные грошы. „Праўда" кажэ, што контррэвалюцыя — гэта справа міжнародных капіталістаў.

ЛЮГАНО. С Пецярбурга наказываюць: У ночы на пятніцу арэштаваны сотні асоб. У пятніцу ў 11 гадзін пачаліся бітвы на вуліцах стрэльбамі і кулемётамі. Зроблены барыкады. За установчы сэйм стаяць работнікі сацыял-рэвалюцыанеры.

---

# Новая рэволюцыя у Расеі.

ПЕЦЯРБУРГ. (П.Т.А). 18.I. Установчы сэйм адчынены 18 студня сёл. г. прэзэсам цэнтральнага камітэту ўсіх Рад. У 4 гадзіны да гэтага чарада (карагод) бальшэвікоў напала на працэсію „Саюза дзеля абароны ўстаноўчага сэйму" і сарвала штандар. Па загаду быў дадзены агонь с кулемётаў. Некалькі асоб забіта, між імі член спаўніцельнага камітэту селянскіх дэпутатаў, Багданов. Шмат асоб, між імі шмат кабет, ранена.

КОПЭНГАГА. Перад адчыненьнем установчага сэйму ў Пецярбурзе было вялікае напяцьце. Урад прасіў жыхараў не паказывацца на вуліцах, бо былі магчымы непарадкі. Былі галасы, што за апошніе дні прыехала ў Пецярбург шмат перэадзетых афіцэраў, каб прыняць учасьце у контррэвалюцыі.

ПЕЦЯРБУРГ. Як установчы сэйм пасьля 1½ гадзінай нарады зробіў пастанову проціў заявы спаўніцельнага цэнтральнага камітэту, бальшэвікі вышлі с салі. Установчы сэйм не згадзіўся з мэтадам, якім вела рада мірные перэгаворы. У 4 гадзіны нараніцы матросы разагналі ўстановчы сэйм. Сягоньня будзе апублікавана заява аб распушчэньні установчага сэйму, каторы ёсьць заканадаўчым урадам.

ШТОКГОЛЬМ. «Правда» грозіць установчаму сэйму вайной, калі ён не прызнае ўсе загады бальшэвіцкага ўраду аб канфіскацыі банкаў, фабрык, аб вядзеньні мірных перэгавораў, скасаваньні ваенных пазык і т. д. Сацыал-рэвалюцыонеры і мерные партыі зварачываюцца да народу с просьбай абараніць установчы сэйм. Украіна прылучылася да сацыалістаў (не бальшэвікоў).

ЛОНДОН. «Daily News» наказывае с Пецярбурга: Саюз дзеля абароны установчага сэйму прыгатаваў на пятніцу вялікіе дэманстрацыі. Гэткіеж клічы чуваць у казармах між матросамі.

---

# Мірные перэгаворы.

БРЭСТ-ЛІТОУСК. (В.Т.Б.). 16.I. Сягоньня да абеду адбылася нарада Чэрніна з украінскімі дэлегатамі, каторая давела да прынцыпіяльнай угоды між цэнтральнымі дзержавамі і Украінай.

БЭРЛІН. Урадовая „Nordd. Allg. Ztg." пішэ:

„Адказ цэнтральных дзержаў выяўляе значны крок дзеля высьненьня палажэньня. Розніцы паглядаў старон узнімаюцца с таго, што расейскіе прэдлаженьня асновываюцца на тэорыі, а нямецкіе рахуюцца с фактамі. Грунт дзеля угоды будзе знойдзен, калі расейскіе прэдстаўнікі ад тэорыі пяройдуць на грунт фактаў.

ВЕНА. У бюджэтнай камісіі аўстрыяцкага парлямэнта міністэр-прэзыдэнт Зэйдлер сказаў аб перэгаворах у Брэсьці, між іншым, гэтак:

„Перэгаворы апошніх дзён, рахуючы да 27 сьнежня, шмат пасунуліся ўпярод. Але лініі, на каторай адбудзецца угода абедзьвых старон, яшчэ не відаць. Нельга зменшаць труднасьцей, які яшчэ нас ждуць. Граф Чэрнін і цяпер дзержыцца высказанага раней пагляду: мір без анексій і контрыбуцій, але захоўваючы свае ўласные інтэрэсы.

БРЭСТ-ЛІТОУСК. 17.I. На сягоньняшніх перэгаворах з украінскімі дэлегатамі гутарка ішла ўжо аб конкрэтных пытаньнях аб абменьне таварамі. Разгляд іх аддадзен у асобную камісію, каторая магчыма скора іх разгледзіць.

БРЭСТ-ЛІТОЎСК. (Тэлегр. К.-В.). Паводлуг заявы генэральнага консула Гэмпеля с Пецярбурга, перэгаворы мешанай камісіі ў Пецярбурзі йдуць удачна ўпярод. Удалося умовіць Расею адрачыся ад стаўляных прашкод у аднаўленьні прыватных пачтовых і тэлеграфных зносін з Расеей. Цяпер укладаюць зробленую угоду на пісьме. Адна падкамісія пачала перегаворы аб абмене аптэчнымі таварамі.

БРЭСТ-ЛІТОУСК. 18.I. Пасьля двох-дзённага перарыву с прычыны хваробы Чэрніна сягоньня адбыліся ізноў два заседаньня. Статс-сэкрэтар Кюльман заявіў, што цэнтральные дзержавы прынцыпіальна годзяцца на паварот уцекачоў і высяленцаў і што пытаньне аб іх павароцi найлепш аддаць на разгляд у каміссію дзеля абмена цывільных палонных. Троцкій

заявіў, што уцекачы цяпер арганізованы ў Расеі паводлуг земляцтв Іх цэнтральны орган напэўна здолее даць усе 'патрэбные ведамасьці.

Пры разглядзе пытаньня, як павінно адбыцца выяўленьне волі народу у справе долі ,занятых зямель, немцы заявілі, што вымаганая расейскай дэлегаціей агульная падача голасу не адпаведае вышыні развіцьця насяленьня гэтых зямель. Троцкій заявіў, што расейская делегація ня може зьмяніць свайго пагляду. Кюльман адказаў на гэта, што утрыманьне парадку ў гэтых землях бязспорна патрэбно. Гэтые землі ўжо шмат пацярпелі ад вайны, і на іх нельга дапусьціць шырэньня рэволюціі.

Далейшы разгляд гэтай справы адложэн.

Пры абмене паглядаў аб абшары зямель, спамянутых у 2 пункце, Троцкій адзначыў, што на карце, паказанай генэралам Гофманам, німа граніц зямель на поўдні ад Брэст Літоўска. Ход самаазначэньня Украіны ешчэ ня гэтулькі развіўся, каб можна было ўжо развязаць пытаньне аб разграничэньні між Расеей і новай рэспублікай. Гэта можэ стацца толькі на аснове волі шырокіх масс. Граф Чэрнін спытаўся Троцкага, чы перэгаворы аб занятых аўстрыяцкім войскам землях павінны быць ведзены с пецярбурскім урадам, чы толькі з украінскай дэлегаціей. Гэтае пытаньне прышлося адлажыць да высьненьня компэтэнціі расейскай і украінскай дэлегацій.

Аб Аляндзкіх астравох выявілася так сама нязгодлівасьць між нямецкімі і расейскімі дэлегатамі, бо Троцкій не хацеў прызнаць права фінляндзкага ураду на незалежную развязку пытаньня аб гэтых астравох. Кюльман заявіў, што ў кожным здарэньні угода аб Аляндзкіх астравох павінна быць падпісана ўсемі дзержавамі, сумежнымі з Аляндзкімі астравамі."

На заседаньні паабедзі Троцкій заявіў, што ён прымушэн на тыдзень паехаць у Пецярбург і з гэтай прычыны просіць заседаньня палітычнай камиссіі адлажыць на 29 студня. У часі яго нябытнасьці галовай расейскай дэлегаціі будзе Іоффе.

БЕРЛІН (В.Т.Б.). 19.І. Урадовая „Nordd. Allg. Ztg." пішэ:

«Перэгаворы с пецярбуской дэлегаціей прынялі вельмі зацяжны характэр. Німа патрэбы гаварыць, хто становіць тормаз. Расейскіе дэлегаты не здаюць сабе справы с таго, што сіла, на якой яны хацелі бы абаперці жаданы для іх мір, ешчэ не істнуе. Калі расейцы думаюць сваімі манэврамі збіць с толку нямецкі народ і нямецкую армію, дык яны вельмі памыляюцца. Троцкій і яго прыяцелі явяцца на установчы сэйм у Пецярбурзі с пустымі рукамі".

БРЭСТ-ЛІТОУСК. 19. І. Перэгаворы між дэлегатамі цэнтральных дзержаў і Украінскай рэспублікай прывялі да згоды што да мірнай умовы. Ваеннае палажэньне павінна лічыцца скончэным, а войскі, што стаяць насупроціў павінны пасьля міра быць узяты назад. Павінны нанава пачацца дыплёматычные консульскіе зносіны. Перэгаворы дайшлі да таго пункту, калі дэлегаціі павінны вярнуцца дамоў, каб згаварыцца с сваімі ўрадамі. Вярнуўшыеся ў бацькаўшчыну дэлегаты павінны, як можна хутчэй вярнуцца назад у Брэст, каб на аснове атрыманых паўнамочый падпісаць умову аб міру.

## Нацыональные адносіны у Расеі.

Есць два цэнтралізмы ў Расеі: цэнтралізм царызму і цэнтралізм дэмократычны. Спагаднікі першага цяпер пахаваліся і выступаюць толькі пад фірмай дэмократычнай і бальшэвіцкай. Пабыўшы цяпер на Беларусі пад Расеей, спачатку здаецца, што чорнасоценцаў ужо нема, аднак часта зайшоўшы на сабраньні розных „народных і дэмакратычных камітэтаў", вы пачуеце: „Ня трэба ніякіх партый, ніякіх націй, далоў беларусаў і украінцаў, ня трэба нам сэпаратыстаў, нехай жыве „единая, недѣлимая, могучая (і часам вырвецца, самодержавная) Россія!" адзін кірунак „на маскоўскую дарогу!" На гэткіх сабраньнях чуецца гэткая ненавісць да ўсяго што ня рускае, што чэлавеку новаму спачатку можэ здацца, быццам гэтые людзі, хоць і для нягоднай справы працуюць шчыра і с праканьня. Але людзі дазнаные скажуць, што ўсё гэта дзеецца загрошы і пакажуць старых слупоў царызму, каторые і пасьля ўпадку цара маюць эканаміцкую сілу і паддзержываюць ёй расейскі нацыоналізм, як гэта робілі і робюць і польскіе шовіністы, не маючы цара. З гэтых „дэмократычных камітэтаў" вядомы камітэт у Гомелі віленскага чарнасоценца, Кавалюка. Гэты камітэт часта прабуе выступаць ад імі беларусаў. Аднак цяпер расейскіе чарносотенцы на Беларусі слабые ў адкрытым ходаньні, і беларускае грамадзянства з імі мала лічыцца.

Расейская дэмакрація ў адношэньні да не расейцаў розьнілася толькі тактыкай ад расейскіх консэрватыстаў. Для расейскай дэмакраціі быў толькі „русскій народъ", за каторым яна другіх народаў не бачыла. Рускі народ узьвелічаўся, ідэалізаваўся. Усё добрае ён толькі робіў. „Русскій народъ" праліваў кроў, баронючы бацькаўшчыну, расейскі народ станаўкі, толерантны, праўдзівы, вялікадушны і т. д. І здавалася, што ў ва ўсей Расеі ёсць толькі адзін „русскій народъ". Гэтак і казалі расейскіе чарнасоценцы. Дэмократы робілі «дэмократычней». Калі часам здараўся пагром у Кіеве або ў Магілёўшчыне, дык у дэмократаў выходзіў на сцэну ўжо ня „русскій народъ", а „невѣжественные хохлы" і „темныя массы бѣларускаго крестьянства".

Здавалася, што ня можэ быць нацыональнага ўціску ад расейскіх сацыалістаў. У гэтым усе народы былі пэўные да рэвалюціі 1917 г.

Царскі ўрад так перасьледаваў сацыалістаў, што аб ніякім уціску з іх боку не магло быць гутаркі. Гэтай пэўнасьці ня было толькі ў некаторых не расейскіх сацыалістаў, бо вось напрыклад, у 1905 г. на сац. сабраньні ў Менску сац. беларусы прамаўлялі па беларуску і расейскіе сацыалісты крычалі: «Тут сабраньне расейскай с. д. партыі, а не этнаграфічны вечар!» Толькі ў расейскай с.-дэмакраціі зусім іншая тактыка ў барацьбе. Усё нацыональнае абкідаецца балотам, завецца буржуазным і контррэволюцыйным. І гэтак выходзіць, што апрача рускага народу, нема ніводнай націі ў Расеі, каторая не былаб буржуазнай і контррэволюцыйнай. Буржуазнымі і контррэволюцыйнымі называюць украінцаў, грузін, татар, беларусаў і хоць іх нацыональные і краёвые і інш., Рады ў справах палітычна-зямельнай і нацыональнай маюць туюж праграму сацыал-дэмакратаў або соцыал-рэволюцыонераў.

Інародцы ў Расеі найболей дазналі крыўды і зьдзеку ад царскай Расеі, а новая царская ўласць вярнулаб перш на перш стары нацыональны ўціск, — і з аднае ўжо гэтае прычыны яны ня могуць быць контррэволюцыонерамі.

Мала таго, што ўсё нацыональнальнае абкідаецца балотам: расейскіе бальшэвікі ўсякаму нацыональнаму самаазначэньню, скіраванаму не да цэнтралізму, пасылаюць ультіматум і ўціскаюць ужываючы аружную сілу. Тут толькі тые бяруць верх, што не паверылі у рускую дэмократыю і арганізавалі нацыональнае войска, як украінцы. Каторыеж гэтага ня зробілі, мусяць бачыць гэнкіе здарэньні, як разгон бальшэвікамі штыхамі і кулемётамі летась з 30—31 сьнежня беларускага конгрэсу ў Менску.

---

## Анастасія Біцэнко

*(некалькі успамінау).*

(Гл. «Гоман» № 6).

«Біцэнко кончыла апавяданьне.

«Расказывалі іншые. Пеялі песьні. Настраеньне было вясёлае, сьвяточнае. Адна толькі Біцэнко, замоўкнуўшы, сумна задумалася, — яна ўжо болей не прынімала учасьця ў агульным вясельлі. Пасьля яна, занятая сваімі думамі, пачала хадзіць па пакою, ні то дэкламуючы, ні то сьпеваючы:

У бітве вялікай ня згінуць бязсьледна
Паўшые с чэсьцью ва імя ідэй...

«Відаць, шта яня не мастак была у пеяньні...

«Гэтая поўная сілы і безграничнага суму рэвалюцыйная песьня, відаць,—як гэта часта с чэлавекам бывае,—прывязалася да яе надоўгіе часіны...

»Яна ўсё хадзіла па пакою і дэклямавала...

І відаць было, што гэные думы, каторые цяпер перэдумывала Біцэнко, былі не вясёлые, што між словамі песьні і яе ў гэты момэнт перэжываньнямі была нейкая незнаная для іншых сувязь. Ад часу да часу яна кідала вокам на сядзеўшага у куце Макса Швайцэра...

У бітве вялікай ня згінуць бязсьледна
Паўшые с чэсьцю ва імя ідэй...

Ізноў дэклямавала, ходзючы с кута у кут Біцэнко...

«Так мы спатыкалі у Смаленску 1904 год...

«Прайшоў ешчэ адзін год.

«У лютым 1905 году газэты наказалі, што ў Пецярбурзе на рагу вул. Марской і Вознесенскага прас-

---

# Што было і што павінна быць.

Вялізны край—гурбэрні: Гродненская, вялікшая часць Віленскай, Мінская, Магілеўская, без мала ўся Вітэбская, заходняя палавіна Смаленскай і паўночная часць Чарнігаўскай, ды адзін-два паветы і іншых губэрняў (Цверскай, Сувальскай і іншых) з няпомных часоў заняў беларускі народ. Перад беларусамі ў гэтым краі ніякага народу ня было; беларусы першые занялі яго і жывуць у ім дагэтуль.

У VIII, IX сталецьці і раней, значыцца больш тысячы гадоў таму назад, беларусы мелі сваё асобнае княжьства с сталіцай у Полацку.

Былі тады беларусы ўжо хрысьціянамі і мелі манастыры. З манастыроў найбольш вядомы у Тураве і Полацку. Мелі шмат кніг духоўных і сьвецкіх.

Усе гэные кнігі пісаны былі па беларуску, так сама, як і умовы, каторые робілі беларускіе князі з другімі народамі.

Па беларуску гаварылі і пісалі князі, епіскопы і ўсё духавенства.

Беларусы ў той час былі народам дужым, і ня толькі не баяліся сваіх суседзяў: палякоў, расейцаў, і іншых, але наадварот шчасьліва з імі вялі войны, ды ня толькі з народамі што гранічылі з Беларусьсю, але і з далёкімі.

Увесь край наш тады быў багатым. У нас ужо тады былі вялікіе месты (гарады) Горадня, (Гродня) Мінск, Вітэбск, Полацак і Смаленск. Месты гэтые былі багатые і харошые; беларусы праз іх вялі вялікі гандаль з заходня-эўропэйскімі народамі.

Пасьля беларусы злучыліся з літвінамі. Сталася адно Літоўска-Беларускае княжьства. У ім, як раней ў адным беларускім княжьстві, ўсё было па беларуску. Па беларуску гаварылі князі, па беларуску пісаліся законы, судзілі і маліліся па беларуску.

Гэта Літоўска-Беларускае княжьства такое было вялікае, пекнае і багатае, што аб ім ведаў увесь сьвет. Суседзі лічылі вялікім гонарам зрабіць саюз з гэтым гасударствам. Беларусы і літвіны не нападалі без дай прычыны на суседніе народы ня крыўдзілі іх, але і не давалі сябе ў крыўду.

Суседзі нашы палякі баяліся сілы, і значэньня нашага княжьства, рознымі спосабамі стараліся пашкодзіць нам. І вось, каб не баяцца беларусаў і каб мець помач проціў другіх сваіх суседзяў, ім рознымі хітрыкамі, наканец, удалося зрабіць саюз між Беларуска-Літоўскім княжьствам і Польшчай, пасватаўшы сваю каралеву Ядвігу за вялікага князя літоўска-беларускага Ягайлу (або Ягелу). Ажаніўшыся с польскай каралевай Ядвігай, Ягайло стаўся разам і каралём польскім.

Гэтае злученьне Беларусі і Літвы с Польшчай было ў 1386 г.

Пасьля злучэньня с Польшчай беларусам прыходзілася выступаць проціў палякоў, бараніцца ад іх, але нашы прэдкі ўмелі ўваходзіць за сваё і не папусьцілі, каб палякі крыўдзілі наш народ. Усё па даўнаму было па беларуску; беларусы разьвіваліся болей і болей.

Наш народ тады быў натта разьвіты і вучоны ці, як кажуць, культурны. Тые рэчы, якіе тады выраблялі на Беларусі, дорага прадавалі заграніцу. І цяпер яшчэ ёсьць трохі астачы даўнейшага нашага гэнага хараштва і багацьця.

Гэная астача, як найдаражэйшы памятнік ёсьць у вялікіх музэях Няметчыны Англіі і Франціі. Часамі з гэных рэчаў і ў нас цяпер можна ўбачыць некаторые, як напрыклад шырокіе ў поў аршына,—каные з золата або срыбра слуцкіе паясы, або арнаты і рызы, а так сама розные другіе ўборы у касьцёлах і цэрквах.

Есьць кніга біблія або пісьмо сьвятое. Гэта кніга натта вялізная. У ёй апісана

пэкту у гасьцініцы «Брыстоль» здарыўся ўзрыў. Сіла ўзрыву была гэтулькі страшэнная, што разрушыла некалькі сумежных пакояў ў нізе, на версе і па баках. Пачаўся пажар Калі пажарнікі загасілі агонь, у пакоі, ў каторым зрабіўся ўзрыў пабачылі страшны абраз: на падлозе каля вакна лежаў страшэнна акалечэны труп чэлавека гэтулькі паранены, што твары яго нельга было пазнаць; часьці яго цела знайшлі перэкінутые праз вуліцу у Ісак'еўскам скверы.

„Следзтво выяснiло, што пагібшый быў замэлідован як англіцкі падданы, акцёр Артур Гэнры Мак Кулён.

«Узрыў зрабіўся ў камодзе ў ночы, калі нешчасны спаў; яго сілай узрыва выкінуло з ложка і кінуло на падлогу...

«Трудно было сумлевацца, што ўзрыў быў рэзультатам нешчасьлівага прыпадку, а пагібшы не быў англіцкім падданым, а замэлідаваўшымся чужым пашпартам расейскім тэррорыстам.

«Я ведаў, што Макс Швэйцэр выбіраўся ў Англію. У мяне з'явілося падазрэньне, што неасьцярожны рэволюціонер—ніхто іншы, як гэта ён, прывёзшый с сабой з Англіі фальшывы пашпарт. Я ўспомніў нашэ спатканьне 1904 г., ўспомніў заховываньне тады А.Біцэнко, і мне тады стала многа ясным...

«У сувязі са ўзрывам у гасьцініцы „Брыстоль“ атдано было пад суд 20 душ. Нешчасьлівае здарэньне ў „Брыстолі“—як выясьнілося—было рэзультатам прыгатаўленьня забойства пецярбурскага граданачальніка Трепова, каторы у 1905 г, сказаў памятные словы: „патронаў не жалець!..»

А. Біцэнко я болей не бачыў. Ня ведаю, якое ўражэньне зрабіла на яе сьмерць Швэйцара... Але пачуў аб ей скора...

У пачатку 1906 г. была зроблена спроба забойства саратаўскага губэрнатара Сахарова. У канцэлярыю к губэрнатару прыйшла нейкая маладая кабета, апранутая як народная вучыцелька і — як гэта заўсёды рабілося тэррорыстамі—падала просьбу і пасьля выстрэліла з рэвольвэра. Быў зроблен толькі адзін выстрэл, ды ён быў сьмяротны і губэрнатар на трэці дзень памёр. Забойцу арэштавалі. Яна аддаласа у рукі паліціі, не баронючыся...

«Гэта была Анастас'я Алексееўна Біцэнко...

«Саратаўская губэрня была тады на ваенным палажэньні. Яе судзіў ваенна-акружны суд. Ей вынясьлі сьмяротны прыгавор. Два тыдні чэкала Біцэнко яго спаўненьня. Нарэшці прыйшло «паміловаеньне». Яе засудзілі на 20 гадоў катаргі!..

«Кару гэтую Б. адбывала ў Нерчынскай цюрьме, пакуль расейская рэволюція не асвабадзіла яе...»

Цяпер яна сідзіць у Брэст-Літоўску побач з іншымі кіраўнікамі лёсамі асвабажджонай ад царскага дэспотызму Расейскай рэспублікі. Разам з іншымі яна, быўшая „катор жніца» апрацовывае варункі міра, маючаго закончыць змаганьне яе нешчаснай бацькаў шчыны, залітай кроўю ад неўдачнай вайны з Нямеччынай і ад унутрэнай барацьбы...

У гэтым чуецца нешта сымволічнае і адначасна глыбока трагічнае.

Ф. О.

## У Вільні і ваколіцах.

× **Падзяка.** Урад Беларускага Таварыства апекі над беднымі і бяздомнымі дзяцьмі „Золак“, засылае, ад імя дзяцей, сэрдэчную падзяку ўсім гаспадаром Старо-Беразоўскай парахвіі, Бельскага павету, за сабраные ў складку і прысланые ў Таварыства на калядны гасьцінец для дзяцей, 68 марак.

× **Пасыльные на вагзалі** Дзеля выгоды публікі на вагзалі цяпер ёсьць пасыльные, каторые выпаўняюць розные загады. За пераноску рэчэй да 25 кіл. (50 нямецкіх фунутў) яны маюць права браць:

а. за хаду да 20 мінут — 0,25 м.
б. „ „ да 40 мінут — 0,50 м.
ц. „ „ да 1 гадз. — 0,75 м.

За кожные далейшые 25 кіл., або часць гэтага, незалежне ад таго, куды трэба несьці, плата на 25 фэн. больш.

× **Чародные кражы каней.** 11 студня на Зарэчнай вул. укradзен конь с санямі, на каторых было 6 пустых мяхоў. Просяць усе весткі падаваць у крымінальную паліцію, Домініканская 1, пакой 89.

У аднаго прыехаўшага ў Вільню селяніна на Завальнай вуліцы укралі сані с кабылай 3 гадоў.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошние дні была (па Цэльсію):

| | найвыш. | найніж. |
|---|---|---|
| 17—18 | — 1,8° | — 5° |
| 18—19 | — 2,4° | — 12,° |
| 19—20 | + 3,6° | — 4,5° |
| 20—21 | + 0,8 | — 11,4 |

## Польская агітацыя ў хлебным бюро на Вілкамірскай вул. ў д. Францкевіча.

— Надовічы П. Л. пайшла ў гэта бюро адмяніць карту. «Ці вы палячка?» пытаюцца ў яе дзьве панечкі: «Не, кажэ, я беларуска»—«А як пані молісься?» «Малюся, пакуль што, па польску». «Дык якаяж пані беларуска, калі молісься па польску?» «Не, кажэ, я беларуска, бо якаяж я палячка, калі с Смаргонь?» „Алеж у Смаргонях усе палякі, беларуская мова брыткая, яе нема, нават каторые запішуцца беларусамі тых перапішуць на рускіх». „Я не дурная, каб свайго чурацца, сказала жонка, і наша мова пекная, ўрэшце нэ дурніце мяне, адпусьціце барждзэй. „Мы не агітуем не агітуем“, зашчэбетала пані Р. ссваей таварышкай“.

## З усяго Краю.

**Начальнік управленьня краем.**

За начальніка управленьня пры глаўнакамандуючым на усходзі назначэн прускі памочнік статс-сэкрэтара барон ф. Фалькэнгаўзэн.

**Курляндзкая выстаўка ў Берліне.**

У каралеўскім музэі штукарства будзе адчынена 25 студня Курляндзкая рухомая выстаўка, каб пазнаёміць нямецкае грамадзянства з гісторыей і бытам Курляндзіі.

**Курс расейскага рубля.**

Загадам Глаўнакамандуючага на ўсходзе курс расейскага рубля ўстанаўліваецца ў 1 марку 50 фэн.

---

КОШЭДАРЫ. Селянін Пётр Маткоўскі падпісаў умову аб прадажы лесу імем Антона Пятроўскага. Суд прызнаў, што Маткоўскі не разумеў усяго цікару свайго праступку і засудзіў яго толькі на 100 руб. штрафу.

СУВАЛКІ. Лоўля рыбы ў вазёрах сувальскага павету здадзена ў арэнду на 1918 г. за 49,000 марак. Ад пачатку лістапада тут адкрыта сушарня бульбы. У ей працуюць 56 работнікаў.

ГРОДНЯ. Быўшый граданачальнік Гродні, Вэйсэнборн, памёр у Нямеччыне. Занімаў ён гэтае мейсцо ад 1 красавіка 1916 г. да 3 марца 1917 г., а пасьля быў пераведзён у прускае міністэрство ўнутрэных спраў.

МІТАВА. Адміністрація «Mitauer Ztg.« выпусьціла кнігу дзеля справак аб пачтовых зносінах у нашым краю. Яна называецца: «Handbuch für den Postverkehr in dem Postgebiet Ob Ost» — і каштуе 2 маркі

КОУНА. Местовы музэй у Коўні можэ сьвяткаваць 20-летнюю гадавіну свайго жыцьця. Ен заложэн у 1898 году ваенным інжэнерам Голышкіным, каторы ўсе геолёгічные знаходы пры будаваньні крэпасьці сабраў разам і аддаў месту. Да гэтаго было далучэно ботанічнае сабраньне прымернікаў расьлін з ваколіц Коўны бар. Мельлэндорфа. Статут музею мае паметку 5 лістапада 1905 году. Першым заведываючым музэем быў Гурзоўскі. Тады музэй занімаў толькі адзін пакой у местовым ратушу. Пасьля сьмерці Гурзоўскага мейсцо яго заняў Тадэуш Довгірд, каторы перанёс музей у цяперашняе памэшчэньне яго на Парадным пляцу. Довгірд прыдаў муз ю нацыянальна-літоўскі характэр. У часі вайны адзін нямецкі афіцэр пад стрэхай аднаго дому знайшоў 30 томаў расейскага гэральдычнаго выданьня аб шляхоцкіх родах Ковенскай губэрні і даровал іх музэю.

БЕЛАСТОК. З аднаго магазыну на Купецкай вул. № 3 злодзеі ў ночы укралі 70 тысяч папірос, 4 тысячы цыгар, каля 50 тысяч марак.

ЛУКІ ПРЫ КАПСОДЗЕ Адзін тутэйшы селянін купіў двое коней, перавёў без пазваленьня ў Нямеччыну і там прадаў. Ен засуджэны на 2 тысячы марак штрафу.

БЕЛАСТОК. На Менскай вул. злодзеі ўлезьлі ў ночы ў кватэру і шмат чаго ўкралі, між іншым увесь пасаг гаспадарскай дачкі, што праз некалькі дзён манілася выйсьці замуж.

СЬВЕНЦЯНЫ. Дзьве тутэйшые народные страўні выдалі за апошні год 300 тысяч абедаў, з іх 180 тысяч дарма.

ЗУБРЫН Сувальск. пав. У апошні пажар тут згарэла трое людзей.

БЕЛАСТОК. У апошнюю мяцеліцу ў тутэйшых ваколіцах згінула 15 чэл., найбольш работнікаў і се-

---

жыцьцё выбранага Богам народу і жыцьцё, і навучаньне І Хрыста і Яго апосталаў. Гэтакую вялізазную кнігу выдаць і цяпер яшчэ рэдка хто можэ, бо на гэта патрэбна і вялікай навукі і працы і вялікага кошту. А ў той час, калі мала было машын, гэта справа была вельмі цяжкая. Але беларусы тады з біблией лёгка справіліся. Перэклаў біблію на беларускую мову беларускі вучоны доктар Скарына с Полацку, а выдалі ў 1517 г. таварыства беларускіх паноў у Вільні і Віленскае мешчанства бургомістрам Бабічам. Летась 1917 г. быў юбілей выданьня бібліі і беларускіе таварыствы на гэты і на той бок фронту сьвяткавалі гэты вялікі дзень.

Беларуская біблія была надрукавана ня толькі раней за расейскую і польскую але і раней за нямецкую і францускую.

Пасьля гэтага яшчэ доўга каля 200 г. беларусы не паддаваліся паляком. Палякі заўсёды стараліся шкодзіць беларусам. У умове пры злучэньні Беларусі і Літвы с Польшчай было пастаноўлена, што, як пачнецца вайна ў Беларусі або Літвы з якім небудзь гасударствам, дык палякі павінны памагаць беларусам, а калі пачне ваеваць с кім-небудзь Польшча, тады беларусы і літвіны паляком. Палякі гэтай умовы не спаўнялі. Наадварот, як толькі беларусы ваевалі з маскоўцамі (расейцамі), то палякі ў той час стараліся што небудзь для сябе вытаргаваць ад беларусаў.

Як у Вялікім Княз'стве Літоўска-беларускім мелася быдь вялікая вайна з Маскоўшчынай (Расеей), а с паўдніа напалі татары, то палякі загразіўшы ад сябе вайной, прымусілі беларусаў і літвіноў згадзіцца у 1569 гаду у Любліне на шкоднае для Беларусі і Літвы цясьнейшае злучэньне с Польшчай.

У 17 сталецьці палякі і польскіе каралі памалу пачынаюць перэцягіваць беларускіх паноў на свой бок, даючы ім прывілеі і аддаючы ім селян (мужыкоў) у паншчыну. Паном падабалася дармавая праца селяні яны памалу перайшлі да палякоў. Шляхтаж, мешчаньне і селяньне асталіся пры сваім беларускім і пачалі ходаньне (барадзьбу) с панамі і палякамі. Вялікшая часьць шляхты, будучы залежнай ад паноў, так сказаць, жывучы с панскай ласкі, пасьля так сама за прывілеі здрадзіла свой народ. Асталіся мешчаньне і селяньне, каторым прышлося бараніцца і ад паноў і ад палякоў. Ведама сілы ўжо цяпер былі ня роўные. Палякі азялі верх і ў 1697 г. было выдано права, што законы павінны пісацца па польску, бо беларускі язык „niedostępny genjuszowi polskiemu“ (гэтак было напісано ў гэным праве). Гэта значыла, што палякі ніяк ня могуць навучыцца па беларуску.

Пасьля гэтага беларуская мова асталася толькі ў царкве і касьцэле.

Беларусы ўжо не маглі так бараніцца ад палякоў, бо селяне былі аддадзены паном у паншчыну і там гаронічалі. мучаліся за сваю мову, за свой наврод і край.

Паны наўмысьля ня вучылі селян граматы, каб тые, навучыўшыся, не пачалі дабівацца сваіх правоў, уваходзіць за усё сваё беларускае. Але калі якому селяніну пашчасьціло вырвацца с паншчыны і ён навучываўся пісаць, то, зараз жэ клікаў селян, каб яны дабіваліся свайго роднага, свае мовы і хоць у кайданах не паддаваліся паляком.

(Далей будзе).

лян, што ішлі ў места або з места. Вялікшасць сьмяротных здарэньняў было ў Гарадку і Заблудове. Старые людзі кажуць, што яны ня помняць за апошніх 30 г. гэткай мяцеліцы.

ГАРАДОК. Адзін тутэйшы гандляр паехаў у санях ў Беласток да доктара. На Магільнай вул. ён на некалькі мінут пакінуў сані с канём. За гэты час каня, гнядую кабылу, ўкралі.

## ВЕСТКІ З РАСЕІ.

ЛЕНДОН. „Daily Telegr." наказуе: Расейскіе ўласьці прэдлажылі румынскім установам у Кішынёве пакінуць расейскую зямлю да 31 студня.

ПЕЦЯРБУРГ. Румынскі пасол Діамандзі арэштован са сваей сьвітай за вострае прасьледаваньне румынскім урадам расейскіх салдатаў. На пратэст заграмічных паслоў расейскі урад згодзіўся выпусьціць румынскага пасла пасьля згоды амэрыканскага пасла заявіць румынскаму ураду пратэст проці уціску расейскіх салдатаў.

ПЕЦЯРБУРГ (П.Т.А.). Румынскаму ураду послан ультіматум, каторы трэбуе выпуску ўраз жэ ўсіх арэштаваных расейскіх салдатаў і афіцэраў. Пад ультіматум падпісаны: Ленін, Крыленко і ваенны паўнамочнік Падвойскі.

ШТОКГОЛЬМ. Вячорные газэты пішуць; што румынскі кароль арэштован і перавезен у Пецярбург.

ПЕЦЯРБУРГ. „День" наказуе з Одэссы, што там арэштованы ўсе бышые тамака румынскіе параходы числом 16, у тым ліку 4 ваенные.

ЛЁЗАННА. Украінскае прэссбюро апавешчае, што партыя незалежнасьці Украіны („самостійнікі"), каторая—супроць соц.-рэв. і соц.-дэм.—жадае поўнага аддзяленьня Украіны ад Расеі, сазывае конгрэсс. Палітычная праграма: на аснове соцыальнага вызваленьня дабіцца поўнай экономічнай і палітычнай незалежнасьці краю. Партыя выступае супроць ідэі фэдэралізму, староннікі каторага цяпер перэважываюць і маюць у сваіх руках уласць.

ШТОКГОЛЬМ. Украінскае інформацыйнае бюро у Штокгольме апавешчае:

Народная рада ў Кіеві атрымала вестку, што конгрэсс мусульмаў ў Туркестану аб'явіў Туркестан за самабытную рэспубліку ў межах фэдэрацыйнай расейскай рэспублікі. У туркестанскай радзе не-мусульманам дадзена трэйцяя часць мейсц. Організован тымчасовы урад.

БЭРЛІН. Цэнтральны камітэт дзеля страваваньня расейскай арміі, ўсерасейскі камітэт дзеля спраў страваваньня, рада народных камісараў дзеля ваенных спраў і камісар дзеля дарожных спраў паслалі да расейскіх жэлезнадарожнікаў іскровую тэлеграму, у каторай крэпка просяць жэлезнадарожнікаў «ад імі галадаючай арміі далей служыць сваей павіннасьці». Тэлеграма канчаецца славамі:«Дайце хлеба для фронту і ратуйце яго ад далейшага голаду. Толькі ваша работа можэ выратаваць рэволюцію».

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 18.І. А 4 гадз. папаабедзі ў Таўрыдскім палацу галава рады раб. і салд. Свердлов адкрыў устаноўчы сэйм, прачытаўшы заяву глаўнага камітэту раб. і салд.

БАЗЭЛЬ. (Гавас). Паводлуг газэтных вестак с Пецярбурга, на вуліцах Одэссы йдуць бітвы між украінцамі і большэвікамі. Дом рады занят украінцамі. Крэйсэр «Сіноп» і іншые ваенные параходы стаяць у порці і абстрэліваюць места.

ПЕЦЯРБУРГ. Рада народных камісараў прыняла 14 студня с. г. закон аб скасаваньні ўсіх заграмічных і ўнутрэнных расейскіх пазык. Грошы пакладзенные ў ашчадніцкіе касы гэным загадам не касуюцца.

ЛЕНДОН. Ніжняя палата. Бальфур заявіў, што Англія офіцыяльных зносін з большэвікамі не падтрымлівае; гэтак сама і з большэвіцкім паслом, Літвіновым.

КІЕЎ. Японскае ваеннае міністэрства наказывае:

Адзін ваенны японскі параход пасланы ў Владзівасток.

## З усяго сьвету.

ЛЮГАНО. «Messagero» наказуе, што з узятых у Флёрэнціі папераў Кайё відаць, што ён маніўся вярнуць у Францію манахаў і выдаліць с краю галавароў ваенай партыі. Апрыч таго ён хацеў вярнуць у Францію членаў панаваўшых некалі дынастый.

ЛОНДОН. Незалежная работніцкая партыя паслала Троцкаму тэлеграму, ў каторай гаворыцца: «Пасьля таго, як Ллейд Джордж, Вільсон і цэнтральные дзяржавы прынялі вашу формулу: «без анэксій і контрыбуцій», мы пачалі кампанію, каб прымусіць наш урад пачаць перэгаворы аб агульным міры. Мы усім сэрцам з вамі ў вашай вялізарнай кампаніі за інтэрнацыоналізмам».

ЛЕНДОН. На нарадзе дэлегатаў прафэсыональных саюзаў Лёйд Джордж сказаў, між іншым: «Для ўзмацаваньня арміі нема ніякага способу, як павялічыць век ваенна абавязаных да 55 г. Ніколі нямецкі урад ня згодзіцца прыняць самые мягкіе варункі міру, калі ён ня будзе да гэтага прымушэны. Калі саюзнікі ня будуць магчы працівіцца цяперашнему ўраду Нямеччыны, то ён заўтра будзе панаваць над сьветам. Калі хто ведае які небудзь спосаб, каб без далейшай вайны скончыць гэты канфлікт, дык я малістую яго імем Бога назваць той спосаб. Па мойму мы павінны выбраць адно з двох, або далей ваеваць, або прызнаць сябе пабітымі».

## ТЭЛЕГРАМЫ.

### Нямецкіе апавешчэньня:

**17.І. Італьянскі тэатр**

У часі атак 14 і 15 студня італьянцы утрацілі палоннымі 12 афіцэраў і больш за 300 салдатаў.

**16.І. Заходні тэатр:**

Жывейшая артылерыйская чыннась у ваколіцах Камбрэ. Пры Пронн узяты палонные.

**19.І. Заходні тэатр:**

Ажыўленые артылерыйскіе бітвы на паўночным усходзі ад Іпра, на палудзенным беразі Скарп і ў ваколіцах Мэвр. Наабапал Маасу агонь так сама крапчэў. На поўначы ад Бэзонво ўзяты палонные французы.

**Македонскі фронт.**

На паўночным усходзі ад Паралова—агонь артылеры і мінамётаў.

**20.І. Заходні тэатр:**

На Остэндэ стрэлялі з мора. На паўночна-захад ад Іпэрн вялікіе артылерыйскіе бітвы цягнуліся да позьнай ночы.

З абодвых бакоў Ліс ля канала Лябасэ, а так сама Ленс і Сан Кантэн баевое дзеяньне павялічылося. Асабліва вялікі быў англіцкі агонь каля Скарб.

### КАЛЯ ВАЙНЫ.

ЛЕНДОН. (Рэўтэр). Два англіцкіе Мінаносцы ў часі буры затанулі з усімі людзьмі ля берагоў Шотляндзіі.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). Нямецкіе падводные лодкі ля заходняга узбярэжжа Англіі затапілі ізноў 4 параходы і 2 рыбаловы.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Адна нямецкая падводная лодка затапіла ў Ірляндзкім моры 6 аружных параходаў ёмкасьцю 32.000 т.

БЭРЛІН (В.ТБ.). Нямецкіе падводные лодкі ў уходняй часьці Сярэдземнага мора затапілі 4 параходы і 1 парусьнік ёмкасьцю разам 25,000 тонн.

## АБВЕСТКІ.

**Марыя Можэйко,** вучыцелька урадовай жэноцкай гімназіі, шукае якой-колечы работы. Маёвая 24.

Выйшоў з друку і прадаецца
**Беларускі Календар**
**на 1918 год.**
Каталіцкіе сьвятцы—па новаму стылю, правасл.—па старому.
**Цэна 50 фэн.**
Дастаць можна ў Беларускай Кнігарні, Вільня, Завальная 7.



Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман». Редактар Язэп Салавей